# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

УДК [39+398.34]: 528.94 (476)

*А. М. Нароўская*

## Этнаграфічныя экспедыцыі як крыніца даследавання традыцыйнага жылля беларусаў

*Раскрываецца выключная роля этнаграфічных экспедыцый XIX–XX стст. у даследаванні і захаванні ўнікальных матэрыялаў аб традыцыйным жыллі беларусаў. Аналізуюцца віды, прыёмы, спосабы назірання і апісання этнаграфічных крыніц. Разглядаюцца этапы збору інфармацыі па вывучэнні народнага жылля. На аснове экспедыцыйных матэрыялаў, сабраных у розныя гады аўтарам і супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, праведзена картаграфаванне прадметаў інтэр'ера традыцыйнага жылля, выяўлены асаблівасці збору і дакументавання помнікаў будаўнічай абраднасці.*

***Ключавыя словы:*** *этнаграфічныя экспедыцыі, этнаграфічныя крыніцы, картаграфаванне, жыллё, інтэр'ер традыцыйнага жылля, будаўнічая абраднасць.*

*A. Narovskaya*

## Ethnographic expeditions as a source of studying the traditional housing of belarusians

*The article reveals the exceptional role of ethnographic expeditions of the XIX–XX centuries in the research and preservation of unique materials about the traditional housing of Belarusians. The author analyzes the types, techniques, methods of observation and description of ethnographic sources, considers the stages of information collection for the study of folk housing. On the basis of expeditionary materials collected in different years by the author and employees of the Belarusian State Museum of Folk Architecture and Life, the article will map the interior items of traditional housing, reveal the features of collecting and documenting monuments of construction rituals.*

***Key words:*** *ethnographic expeditions, ethnographic sources, mapping, dwelling, interior of a traditional dwelling, building rites.*

Фарміраванне этнаграфіі як навукі ў пачатку XIX ст. грунтавалася пераважна на матэрыялах непасрэднага вывучэння жыцця народаў розных краін. У той час палявыя назіранні пераcталі быць выпадковымі, ствараліся праграмы для збірання звестак і з'явіліся першыя анкеты (напрыклад, анкета Рускага геаграфічнага таварыства 1845 г.).

Даследчыкі выкарыстоўвалі новыя прыёмы, метады назіранняў, апрацоўкі іх вынікаў (методыка апісанняў, картаграфавання з’яў, правілы запісу этнаграфічных матэрыялаў і інш.). Палявыя назіранні сталі спосабам назапашвання крыніц этнаграфіі з пэўнай методыкай атрымання неабходных звестак. Ператварэнне этнаграфіі ў гістарычную навуку, якая не проста вывучае асаблівасці жыцця народа, а разглядае заканамернасці гістарычнага развіцця этнасаў, адметнасці яго культуры і побыту, значна пашырыла базу крыніц этнаграфіі.

Навукоўцы другой паловы XX – пачатку XXI ст. прысвяцілі шэраг публікацый праблеме класіфікацыі гістарычных крыніц. Паводле прапанаваных крытэрыяў у аснове дзялення крыніц на тыпы пакладзены спосаб кадзіравання заключанай у іх інфармацыі. Згодна з гэтым, Л. М. Пушкароў вылучыў наступныя тыпы гістарычных крыніц: пісьмовыя, рэчавыя, вусныя (фальклор), этнаграфічныя, лінгвістычныя, кінафотадакументы, фонадакументы [15].

Такім чынам, этнаграфія – гэта гістарычная дысцыпліна, таму палявыя этнаграфічныя матэрыялы можна аднесці да разнавіднасці гістарычных крыніц, у той жа час яны ад іх адрозніваюцца. Асноўнымі фактычнымі данымі для этнаграфіі з’яўляюцца матэрыялы, якія свядома збіраюцца ў працэсе палявой працы.

І. Г. Бачыла, Г. Г. Громаў, Т. А. Навагродскі [4; 8; 11] прысвяцілі шэраг работ методыцы правядзення этнаграфічных экспедыцый. У даследаваннях даюцца асноўныя патрабаванні да навуковай, метадычнай і тэхнічнай іх падрыхтоўкі, практычныя прыёмы этнаграфічнага вывучэння традыцыйнай культуры і побыту.

Шэраг фундаментальных прац прысвечана аналізу дзейнасці этнографаў XIX – пачатку XX ст., якія сабралі ўнікальны матэрыял па традыцыйнай культуры беларусаў у час экспедыцый. Сярод найбольш значных манаграфіі В. К. Бандарчыка па гісторыі беларускай этнаграфіі [2; 3].

Асноўны метад вывучэння этнічнай культуры стаў шырока ўжывацца ў сярэдзіне XIX ст. Значная роля ў даследаванні традыцыйнай культуры беларусаў належыць Рускаму геаграфічнаму таварыству (РГТ). Яно накіравала ў Паўночна-Заходні край шэраг этнаграфічных экспедыцый з С. В. Максімавым (1867–1868), П. П. Чубінскім (1869–1870), Е. Р. Раманавым (1886, 1889, 1890–1891, 1895), У. М. Дабравольскім (1896), І. С. Абрамавым (1907) і інш.

Этнограф С. В. Максімаў у складзе этнаграфічнай экспедыцыі наведаў Смаленскую, Магілёўскую, Віцебскую, Віленскую, Гродзенскую і Мінскую губерні. Матэрыялы экспедыцыі былі надрукаваны ў часопісе «Живописная Россия» (трэці том). У 1908 г. у Пецярбургу было створана «Этнаграфічнае бюро», у якім С. В. Максімаў падрыхтаваў кнігі па бела-

рускай міфалогіі (народныя звычаі і вераванні): «Нячыстая сіла» (1899) і «Нячыстая, невядомая і хрэсная сіла» (1903) [2, с. 77].

Экспедыцыю ў Паўднёва-Заходні край ажыццявіў этнограф П. П. Чубінскі (1869–1870) з мэтай абследавання ўкраінскіх губерняў, Мінскай і Гродзенскай. Вучоны сабраў і сістэматызаваў багаты па змесце фальклорны і этнаграфічны матэрыял, які ўвайшоў у 7-томнае выданне «Працы этнаграфічна-статыстычнай экспедыцыі ў Заходне-Рускі край…» (1872–1878) [Там жа, с. 81].

На матэрыялах экспедыцый грунтуюцца фундаментальныя працы этнолагаў XIX – пачатку XX ст. П. В. Шэйна, М. Я. Нікіфароўскага, А. Я. Багдановіча, Е. Р. Раманава, І. А. Сербава, Я. Ф. Карскага, А. К. Сержпутоўскага і інш.

Значны ўклад у вывучэнне традыцыйнага жылля беларусаў зрабіў П. В. Шэйн. Даследчык быў сябрам Паўночна-Заходняга аддзела РГТ, што садзейнічала распрацоўцы праграмы па збіранні фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу і распаўсюджванні яе па Беларусі. Метадалагічны ўзровень праграмы (абавязковая пашпартызацыя матэрыялу) быў даволі высокі. П. В. Шэйн з’яўляўся папячыцелем Віцебскай вучэбнай акругі. Адзіная яго экспедыцыя па Беларусі адбылася ў 1877 г. Наладзіўшы сетку карэспандэнтаў з ліку настаўнікаў, вучняў па ўсёй Беларусі, яму ўдалося сабраць каштоўны матэрыял, апрацаваць яго і выдаць зборнік «Беларускія народныя песні» (1873), 3 тамы «Материалов для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края» [21]. «Матэрыялы…» П. В. Шэйна сталі першай грунтоўнай публікацыяй, у якой даследчык даў апісанне і характарыстыку беларускага побыту, акрэсліў асаблівасці абраднасці, звязанай з жыллём беларусаў.

Працы М. Я. Нікіфароўскага прысвечаны вывучэнню побыту і культуры Паўночнай Беларусі. Яго «Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности» (1895) – гэта першае сістэматычнае і ўсебаковае даследаванне беларускай матэрыяльнай культуры [13]. М. Я. Нікіфароўскі падрабязна апісаў элементы інтэр’ера (печы, покуці, лавы, палаці, сталы, калыскі, дзіцячыя хадункі і інш.), указваючы памеры, прадставіў планы, чарцяжы розных тыпаў жылля. Пры апісанні інтэр’ера ён падкрэсліў сацыяльную дыферэнцыяцыю сялянства і паказаў уплыў яе на змены ў абсталяванні, што ўзмацняе навуковую каштоўнасць працы як этнаграфічнай крыніцы.

Найбольш значнымі для вывучэння этнічнай культуры беларусаў з’яўляюцца этнаграфічныя даныя, сабраныя М. Я. Нікіфароўскім, аб прыкметах і павер’ях, старадаўніх абрадах і звычаях, звязаных з будаўніцтвам жылля [14]. Аўтар, апісваючы побыт сялян, карыстаецца заўвагамі і зноскамі, якія тлумачаць асобныя словы і тэрміны, указаннем мясцовасці (у алфавітным парадку), дзе былі сабраны звесткі з жыц-

ця беларускай вёскі. З'яўленне геаграфічнага паказальніка ў зборніку этнаграфічных матэрыялаў сведчыць аб тым, што М. Я. Нікіфароўскім былі зроблены першыя спробы пашпартызацыі зафіксаваных з'яў культуры.

Вядомы беларускі этнограф А. Я. Багдановіч прысвяціў побытавай культуры і звычаям беларусаў нарыс [7]. У працы ён прыводзіць прыклады абрадаў і ўяўленняў, звязаных з жыллём. Этнаграфічныя матэрыялы сабраны аўтарам у Барысаўскім, Ігуменскім, Мінскім, Слуцкім і Навагрудскім паветах Мінскай губерні, Сенненскім і Аршанскім – Магілёўскай і Лепельскім – Віцебскай губерні. Усе запісы матэрыялаў былі зроблены асабіста аўтарам; назіранні праводзіліся ім на працягу многіх гадоў [Там жа, с. 5].

У часопісе «Этнографическое обозрение» (1889–1916), які выходзіў пры Маскоўскім універсітэце, беларускі кірунак узначальваў М. А. Янчук. Даследчык рассылаў этнаграфічныя праграмы, вёў перапіску з беларускімі аматарамі-этнографамі. У выніку яго дзейнасці ў часопісе было апублікавана некалькі дзясяткаў артыкулаў і нарысаў па этнаграфіі, у якіх змешчаны цікавыя звесткі аб беларускім традыцыйным жыллі.

На працягу 1910–1917 гг. Паўночна-Заходнім аддзелам РГТ (створаны ў Вільні ў 1910 г.) быў выкананы вялікі аб'ём этнаграфічнай працы, сярод якой наладжванне экспедыцый. У гэты перыяд А. К. Сержпутоўскім было арганізавана 13 навуковых паездак па Мінскай, Гродзенскай, Віцебскай, Магілёўскай губернях. У «Кароткай праграме для збору этнаграфічных прадметаў на Беларусі» А. К. Сержпутоўскі ўпершыню падкрэсліў неабходнасць не толькі фіксацыі прадметаў, але і падрабязнага апісання мясцовасці і жыцця таго народа, дзе збіраюцца калекцыі. Па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый ім апублікаваны працы па духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў: «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (1930), вялікая этнаграфічная праца «Быт беларусаў» (не захавалася) [11]. Гэта былі своеасаблівыя справаздачы, якія не змяшчалі навуковых абагульненняў, але ўяўлялі вялікую каштоўнасць па наяўнасці найбагацейшага фактычнага матэрыялу.

Беларускі этнограф І. А. Сербаў зрабіў значны ўнёсак у вывучэнне архітэктурных асаблівасцей жылля беларусаў. Ён наведаў Пінскае Палессе, Кобрынскі, Пружанскі і Слонімскі паветы Гродзенскай губерні (1913), зрабіў унікальныя фотаздымкі падчас паездак па Беларусі, пераважна па раёнах Палесся, у 1911 і 1912 гадах [18]. Па матэрыялах экспедыцый аўтар напісаў шэраг кніг, у якіх даецца апісанне асноўных рыс побыту палешукоў-дрыгавічоў (звесткі пра традыцыйнае жыллё, мэблю, посуд і інш.), адлюстраванне багатага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу [17]. Гэта былі першыя падобнага роду выданні, якія знаёмілі з побытам беларускага народа асобна ўзятага лакальнага арэала.

Энцыклапедыяй народнага жыцця з'явіўся 9-томны «Белорусский сборник» Е. Р. Раманава (1886–1912), у якім адлюстраваны амаль усе бакі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў [16]. Аўтар дае апісанне як інтэр'ера сялянскай хаты, прыводзячы назвы яго асобных элементаў, так і планіроўкі жылля і падсобных памяшканняў. У 1909 г. Е. Р. Раманаў апублікаваў «Кароткія ўказанні для правядзення археаграфічных экскурсій сярэднімі навучальнымі ўстановамі Віленскай навучальнай акругі», а ў 1912 г. выслаў студэнтам беларускага навукова-літаратурнага гуртка Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта «Разгорнутую праграму даследавання Беларусі». У праграме былі вызначаны найбольш актуальныя кірункі ў збіральніцкай і навуковай дзейнасці ў галіне фальклору і этнаграфіі.

Пэўны ўклад у назапашванне этнаграфічных даных па Беларусі ўнеслі А. М. Семянтоўскі, М. В. Доўнар-Запольскі. У шматтомным выданні працы «Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі, сабраныя афіцэрамі Генеральнага штаба» змешчаны звесткі аб культуры, быце і вусна-паэтычнай творчасці беларускага народа сярэдзіны XIX ст. [2, с. 61]. Выгадна адрозніваецца ад папярэдніх тамоў «Матэрыялаў…» работа П. В. Баброўскага «Гродзенская губерня», у якой даецца апісанне жылля і гаспадарчых пабудоў [Там жа, с. 66].

Такім чынам, у выніку экспедыцый у другой палове XIX – пачатку XX ст. былі сабраны ўнікальныя фальклорна-этнаграфічныя калекцыі. Значная частка тэкставых палявых матэрыялаў была надрукавана. Поўныя і кароткія публікацыі палявых збораў: манаграфіі, артыкулы і кароткія нататкі былі змешчаны ў шматтомным перыядычным выданні «Записки Императорского Русского географического общества по отделению этнографии». Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый друкаваліся таксама на старонках мясцовых губернскіх ведамасцей («Магілёўскія губернскія ведамасці», «Гродзенскія губернскія ведамасці», «Віцебскія губернскія ведамасці»), часопіса «Жывая даўніна», газет «Віленскі веснік», «Смаленскі веснік» і інш.

У даваенны час даследчыкі працягнулі экспедыцыйную дзейнасць па вывучэнні матэрыяльнай культуры беларусаў. Багаты фактычны матэрыял па традыцыйным беларускім жыллі сабраны А. М. Харузіным у час экспедыцый па Беларусі (пераважна ў паветах Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў) у 1920-я гг. [20]. Аўтар адзначыў, як сацыяльна-эканамічныя змены, што адбыліся ў другой палове XIX ст., уздзейнічалі на планіроўку і інтэр'еры жылля. Адбылося знікненне волакавых вокнаў і скляпеністых столей, павелічэнне колькасці і памераў вокнаў, аб'ёму жылля і змяненне ўнутранай планіроўкі. Шмат месца ў працы аўтар адводзіць этымалогіі слоў, звязаных з элементамі інтэр'ера, і дае ім параўнаўчую характарыстыку. Аднак праца А. М. Харузіна носіць пера-

важна абагульняючы характар. Матэрыялы з Паўночнай Беларусі разгледжаны ў ёй слаба.

У 1920-х гг. зборам інфармацыі па традыцыйным жыллі беларусаў займалася этнограф Н. І. Лебедзева. Асаблівую цікавасць уяўляе яе праца «Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР…». Даследчык прыводзіць прыклады размяшчэння прадметаў мэблі ў інтэр'еры сельскага жылля [9].

Праца па вывучэнні беларускага жылля значна пашырылася ў пасляваенны час. У выніку арганізацыі шматлікіх этнаграфічных экспедыцый у розныя раёны Беларусі быў сабраны фактычны матэрыял, які характарызуе сялянскія пабудовы XIX – пачатку XX ст. На аснове атрыманых этнаграфічных крыніц у 1950-я гг. выйшла грунтоўная манаграфія Я. Э. Бломквіст, у якой апісваюцца сялянскія пабудовы рускіх, украінцаў, беларусаў [6].

У 1950-я гг. вывучэнне традыцыйнай культуры беларусаў ажыццяўлялася супрацоўнікамі сектара этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі АН БССР. З 1957 г. даследаванне беларускага этнасу было перададзена сектару этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

Вывучэннем культуры беларусаў у другой палове XX ст. займалася этнограф Л. А. Малчанава. У яе кнізе «Материальная культура белорусов» (1968) апісана традыцыйнае жыллё палескіх вёсак Беларусі [11]. У 1950-х гг. сумесна з М. Я. Грынблатам яна даследавала жыллё жыхароў Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Пры збіранні матэрыялаў навукоўцы выкарыстоўвалі асабістае назіранне, фотафіксацыю, апытанні. Яны параўналі сялянскую сядзібу да і пасля 1920-х гг., выявілі памеры, структуру і добраўпарадкаванне двароў, прыёмы і матэрыялы будаўніцтва. Вынікам даследаванняў рэгіянальных і лакальных асаблівасцей жылля стала калектыўная праца «Беларускае народнае жыллё» [5]. У ёй вызначаны рысы традыцыйнай архітэктуры Беларусі, разгледжана планіроўка сядзіб, канструкцыйныя асаблівасці пабудоў і інш.

Цікавыя звесткі па народным жыллі былі выяўлены ў архіве Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР. Матэрыялы, сабраныя падчас экспедыцый, прадстаўлены пераважна ў выглядзе запісаў, якія зроблены этнографамі для стварэння рэгіянальнага гісторыка-этнаграфічнага атласа [1].

Метад палявых даследаванняў шырока выкарыстоўваўся архітэктарамі і этнографамі пры пошуку традыцыйнага жылля для экспазіцый Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Першапачаткова ў музеі былі арганізаваны тры аддзелы: Заходняга і Усходняга Палесся, Паазер'я і Падняпроўя, Цэнтральнай Беларусі

і Панямоння. У кожным аддзеле працавалі 2 архітэктары і 2 этнографы. У час этнаграфічнай экспедыцыі, якую складалі 3–4 навуковыя супрацоўнікі, выкарыстоўваўся маршрутны альбо куставы метад даследавання. Паводле «лінейнага» маршруту экспедыцыя спынялася каля цікавых помнікаў драўлянага дойлідства, а пры куставым спосабе адбывалася паглыбленае даследаванне матэрыялаў, якія збіраліся 5–7 дзён, у арэале.

Правядзенню кожнай экспедыцыі папярэднічала падрыхтоўчая карпатлівая праца: высвятлялася інфармацыя пра арэал даследавання; вызначаліся мэты і задачы палявой працы; вывучалася спецыяльная літаратура і праглядалася картатэка фондаў, што дазваляла выявіць наяўнасць у іх прадметаў інтэр'ера, музейных калекцый.

У час экспедыцый навукоўцамі выкарыстоўваліся разнастайныя прыёмы: асабістыя назіранні, гутарка з мясцовымі жыхарамі (інфарматарамі) з мэтай выяўлення і фіксацыі даных аб розных аспектах матэрыяльнай (пасяленнях, жыллі, прадметах побыту) і духоўнай (абрадах і ўяўленнях, звязаных з будаўніцтвам жылля, традыцыях, звычаях у сямейнай і каляндарнай абраднасці) культуры. Яны забяспечвалі рэпрэзентатыўнасць архітэктурна-этнаграфічных матэрыялаў.

Графічныя і выяўленчыя крыніцы дазволілі этнографам і архітэктарам у час працы над тэматыка-экспазіцыйнымі планамі, праектнымі работамі ўявіць сабе не толькі факт існавання тых ці іншых з'яў, але і тое, як выглядала традыцыйнае жыллё, асобныя прадметы інтэр'ера: печ, покуць, стол, лавы і г. д. Фіксаваліся таксама месца і час стварэння жылых, сакральных і гаспадарчых пабудоў, стыль, матэрыял вырабу.

Такія работы былі праведзены навуковымі супрацоўнікамі музея пры зборы інфармацыі і правядзенні абмерных работ у в. Садавічы Капыльскага раёна, в. Ісерна і в. Агароднікі Слуцкага раёна, в. Заброддзе Стаўбцоўскага раёна (гісторыка-этнаграфічны рэгіён Цэнтральная Беларусь) [10]; в. Волева Дубровенскага раёна, в. Бракава Слабада Чавускага раёна Магілёўскай вобласці (гісторыка-этнаграфічны рэгіён Падняпроўе); в. Будзічы Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці, в. Варашылкі Мядзельскага раёна Мінскай вобласці (гісторыка-этнаграфічны рэгіён Паазер'е) [19]. Пазней усе гэтыя ўнікальныя помнікі драўлянага дойлідства былі перавезены ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту.

У час этнаграфічных эспедыцый Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту аўтарам дадзенага артыкула быў сабраны ўнікальны матэрыял, звязаны з канструкцыйнымі асаблівасцямі жылля, будаўнічай тэрміналогіяй. У выніку было праведзена картаграфаванне элементаў інтэр'ера, зроблены фотаздымкі і малюнкі прыстасаванняў для асвятлення жылля [12]. Акрамя маршрутнага і ку-

ставога метадаў, аўтар выкарыстаў стацыянарны спосаб даследавання пры вывучэнні традыцыйнага жылля ў в. Аздамічы Столінскага раёна, аг. Стараволя Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці, былой в. Надтачаеўка Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці. Шляхам непасрэднага назірання сабраны дакладныя звесткі аб канструкцыйных асаблівасцях інтэр’ераў традыцыйнага жылля, будаўнічай абраднасці, прадметах інтэр’ера і іх сімвалічным значэнні ў каляндарна-сямейнай абраднасці жыхароў Заходняга і Усходняга Палесся. Пры правядзенні палявых этнаграфічных даследаванняў аўтар імкнуўся найбольш поўна і падрабязна апісаць стратэгію выбару месца для будаўніцтва жылля, асаблівасці выкарыстання будаўнічага матэрыялу (улічваліся як яго якасці, так і сакральны сэнс). Шмат увагі надавалася як адметнай сацыяльнай арганізацыі калектыву ў будаўнічай абраднасці, так і вывучэнню фіксацыі пераходу ў новае жыллё (уваходзіны, улазіны). Напрыклад, на Гродзеншчыне адзначаны сяміэтапныя ўваходзіны ў новы дом. На Міншчыне пускалі спачатку ў дом пеўня альбо курыцу, на Усходнім Палессі – ката чорнага альбо трох масцей (в. Пагост, Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці).

Праводзілася фіксацыя лакальных назваў частак жылля, элементаў інтэр’ера. Нярэдка ў розных рэгіёнах і нават у суседніх вёсках жыллё магло мець розныя назвы: хата (аг. Слабада, Мазырскі раён Гомельскай вобл.); дом (в. Балажэвічы, Мазырскі раён); лабаз – «старая, абы-якая пабудова» (в. Малы Малешаў, Жыткавіцкі раён); «лепенда» – прымітыўная пабудова (в. Малы Малешаў, Жыткавіцкі раён); «хіжына» – маленькая старая хата (в. Бібікі, Мазырскі раён).

Фіксацыя традыцыйнага жылля, інтэр’ера, мэблі адбывалася з дапамогай фатаграфавання, дзякуючы якому захаваліся спосабы ўпрыгажэння святочнага інтэр’ера, напрыклад аздабленне абразоў «набожнікамі» (узорнымі ручнікамі), саламянымі вырабамі і інш.

У выніку шматгадовых экспедыцый Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў розныя рэгіёны Беларусі быў назапашаны ўнікальны матэрыял па асаблівасцях традыцыйнага жылля канца XIX –пачатку XX ст., праведзена картаграфаванне элементаў яго інтэр’ера.

Такім чынам, спецыфіку этналагічных даследаванняў складае выкарыстанне ў якасці важнай крыніцы матэрыялаў палявых этнаграфічных экспедыцый. У XIX – пачатку XX ст. адбылося станаўленне этнаграфіі як навукі, з’явіўся шэраг вучоных, якія вывучалі традыцыйную культуру. Шырокамаштабны і сістэмны характар палявых даследаванняў гэтага перыяду прывёў да назапашвання і ўвядзення ў навуковы абарот вялікага аб’ёму этнаграфічных матэрыялаў. Але яны насілі наратыўны характар, а ўзровень тэарэтычнага асэнсавання абмяжоўваўся нязначнымі аўтарскімі каментарыямі.

Другая палова XX – пачатак XXI ст. адзначаны тэарэтычнымі працамі навукоўцаў па гістарыяграфіі, па методыцы правядзення этнаграфічных экспедыцый і апрацоўцы сабраных матэрыялаў. Тэматыка і метады даследаванняў істотна пашырыліся. Этнаграфічныя экспедыцыі 1970–2000-х гг. мелі больш прыкметныя вынікі – сабраны ўнікальны матэрыял пра помнікі драўлянага дойлідства, якія сёння знаходзяцца ў экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

*1.* Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (АІМЭФ). – Ф. 6. Воп. 11. Спр. 747. Арк. 2–5 ; Спр. 752. Арк. 2–5 ; Спр. 804. Арк. 2–8.

*2. Бандарчык, В. К.* Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. / В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1964. – 282 с.

*3. Бандарчык, В. К.* Гісторыя беларускай этнаграфіі, пачатак XX ст. / В. К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 123 с.

*4. Бачыла, І. Г.* Кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ: вопыт палявых этнаграфічных даследаванняў / І. Г. Бачыла // Туризм и гостеприимство. – 2018. – № 1. – С. 62–66.

*5.* Беларускае народнае жыллё / Э. Р. Сабаленка [і інш.] ; Акадэмія навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 127 с.

*6. Бломквист, Е. Э.* Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов (поселения, жилища и хозяйственные строения) / Е. Э. Бломквист // Восточнославянский этнографический сборник : Очерки народной материальной культуры русских, украинцев и белорусов в XIX – начале XX в. / отв. ред. С. А. Токарев. – М., 1956. – С. 3–458. – (Труды Института этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая. Новая серия / Акад. наук СССР ; т. 31).

*7. Богданович, А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов : этнографический очерк / А. Е. Богданович ; отв. ред. О. А. Платонов. – М. : Ин-т рус. цивилизации, 2015. – 160 с.

*8. Громов, Г. Г.* Методика этнографических экспедиций / Г. Г. Громов. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1966. – 108 с.

*9. Лебедева, Н. И.* Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. Мозырский и Бобруйский округа по левому берегу Припяти и ее притокам : материалы экспедиции 1927 г. / Н. И. Лебедева. – М. : Тип. МОНО, 1929. – Т. I. – 86 с.

*10. Локотко, А. И.* Белорусское народное зодчество: середина XIX–XX в. / А. И. Локотко ; ред. В. К. Бондарчик. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 287 с.

*11. Навагродскі, Т. А.* Этнаграфічныя экспедыцыі кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ (2001–2021) / Т. А. Навагродскі // Пічэтаўскія чытанні – 2021: 100 гадоў БДУ – першаму ўніверсітэту Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэтыч. канф., Мінск, 27–28 кастр. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Д. Кароль (гал. рэд.) [і інш.] ; навук. рэд.: М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі. – Мінск, 2021. – С. 559–565.

*12. Нароўская, А. М.* Інтэр'ер традыцыйнага народнага жылля / А. М. Нароўская // Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ-ры, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; А. І. Лакотка [і інш.]. – Мінск, 2015. – Т. 3 : Культура сяла XIV – пачатку XX ст., кн. 1 : Матэрыяльная культура / А. І. Лакотка [і інш.]. – С. 186–194.

*13. Никифоровский, Н. Я.* Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности: этнографические данные: с географическим видом Витебской губернии и четырьмя чертежами в тексте / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. тип., 1895. – VIII, 552 с.

*14. Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах... Витебской Белоруссии / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. типо-литогр., 1897. – X, 344 с.

*15. Пушкарев, Л. Н.* Классификация русских письменных источников по отечественной истории / Л. Н. Пушкарев ; АН СССР, Ин-т истории СССР. – М. : Наука, 1975. – 281 с.

*16. Романов, Е. Р.* Белорусский сборник : в 9 вып. / Е. Р. Романов. – Вильно : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – VIII, 600 с.

*17. Сербов, И. А.* Белорусы-сакуны: краткий этногр. очерк / И. А. Сербов. – Петроград : Тип. Императ. акад. наук, 1915. – [2], II, XVII, 180 с. – (Сб. Отд. рус. яз. и словесности Академии наук ; т. 94, № 1).

*18. Сербов, И. А.* Поездки по Полесью 1911 и 1912 гг. / И. А. Сербов. – Вильна : Сев.-Зап. отд. Императ. Рус. геогр. о-ва, 1914. – 51 с.

*19. Сергачев, С. А.* Народное зодчество Беларуси: история и современность / С. А. Сергачев. – Минск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2015. – 559 с.

*20. Харузин, А.* Славянское жилище в Северо-Западном крае: из материалов по истории развития славянских жилищ / А. Харузин. – Вильна : Типо-литогр. т-ва п. ф. «Н. Мац и К°», 1907. – 342 с.

*21. Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : в 3 т. / П. В. Шейн. – СПб. : Тип. Императ. акад. наук, 1902. – Т. 3 : Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени, игры, верования, обычное право; чародейство, колдовство, знахарство, лечение болезней, средства от напастей; поверья, суеверья, приметы и т. д. – IV, 535 с.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 13.12.2022.